## ЯКУБ КОЛАС



Нарадзіўся Якуб Колас у вёсцы Акінчыцы на Стаўбцоўшчыне ў сям'і лесніка. З маленства ён разам з бацькамі пераязджаў з адной леснічоўкі ў другую. Жыццё ў лясной глушы давала магчымасць уражліваму хлопчыку адчуць чароўную прыгажосць беларускіх краявідаў. Пазней дзіцячыя ўражанні пісьменніка ляглі ў аснову многіх вершаў і апавяданняў, прысвечаных непаўторнай прыгажосці прыроды Беларусі.

Якуб Колас напісаў для дзяцей паэму «Міхасёвы прыгоды», казку «Рак-вусач» і іншыя творы.

## Ясныя дні восені

Сярод гнілой восені выдаюцца часам ясныя, светлыя дні. Ціха ўсюды. Вецер не скалыхне́ ні адзін лісцік, ні адну травінку. Ласкавае неба пазірае на зямлю; нідзе ні хмурынкі. Ясна і хораша, усё роўна як вярнулася лета. Падарыла восень людзям яшчэ некалькі ясных, светлых і цёплых дзён.

Хоць усюды і ціха, цёпла і ясна, але ўжо не вее тым жыццём, якое відаць вясною. Куды ні



Правообладатель Национальный институт образования

кінь вокам, на ўсім бачыш след восені. Хмурны хваёвы лес чуць заслаўся сінім дымком туману... А бярозы, асіны і дубы чырванеюць здалёк сваім лісцем і напамінаюць сабою аб восені. На ўсім ляжыць сіняваты слой не то дыму, не то туману.

А прыслухаешся — такая цішыня навокал!.. Толькі часам закрычаць у небе дзікія гусі, ключом пранясуцца жураўлі і схаваюцца ў сініх хвалях далёкага яснага неба. Крык іх заціхае памалу і замрэ, расплывецца ў цішыні асенняга дня.

Плаўна носіцца ў паветры белая павуціна, сцелецца па зямлі, чапляецца за кусты і сухую траву. Прайшло цёплае лета. Апошнія вы, ясныя дзянькі восені!..

*Паводле Якуба Коласа.*



1. Якімі днямі восені захапляецца Якуб Колас? Падмацуйце адказ радкамі з твора.
2. Як вы разумееце сэнс выразаў «куды ні кінь вокам» і «гнілая восень»? Растлумачце.
3. Якія словы і выразы ажыўляюць восеньскія прыкметы? Знайдзіце і прачытайце іх.
4. Якая асноўная думка закладзена пісьменнікам у гэтай пейзажнай замалёўцы?
5. Калі і дзе вы назіралі праяўленне бабінага лета? Раскажыце.



Правообладатель Национальный институт образования